Die Freundschaft kennt keine Grenzen.

Дружба не ведае межаў

КАНТАКТЫ

Апошнім часам жыццё ўсё больш настойліва патрабуе актыўнай дзейнасці. І адным з важнейшых яе напрамкаў з'яўляецца пашырэнне кантактаў і наладжванне дзелавых сувязяў, у тым ліку і з замежжам. Прыкладаў таго, якую карысць прыносяць такія сувязі прадпрыемствам і арганізацыям раёна, можна прывесці нямала. Ёсць яны не толькі ў вытворчасці, у сферы культуры, але і ў сістэме адукацыі, што з разлікам на будучыню не менш важна і цікава.

Пакуль жа гэта самыя звычайныя дзеці, якія вучацца ў Варапаеўскай сярэдняй школе. Вызначае іх хіба што асаблівая ўвага да вывучэння нямецкай мовы, якую з нядаўняга часу тут пачалі выкладаць з першага класа. Многія вучні школы разам з настаўнікамі пабывалі ў Германіі.

А пачалося ўсё з таго, што ў Варапаеўскай сярэдняй школе па ініцыятыве настаўніцы нямецкай мовы Святланы Арсеньеўны Івановай быў створаны клуб інтэрнацыянальнай дружбы. Пад яе кіраўніцтвам клуб наладзіў перапіску з рэальнай школай горада Герцоген Аураха зямлі Баварыя. Святлана Арсеньеўна на гэтым не спынілася, і неўзабаве клуб выйшаў на новы, больш высокі ўзровень — абмен дэлегацыямі, што сведчыць аб сапраўды плённай рабоце клуба і яго кіраўніка.

Зацікаўленасць у наладжванні такіх кантактаў праявіў і нямецкі бок. Такім чынам, вучні і педагогі Варапаеўскай СШ пабывалі ў Германіі, мелі магчымасць прайсці добрую моўную практыку, бо жылі ў нямецкіх сем'ях, пазнаёміліся з жыццём краіны і яе людзей.

Шчыра прымалі яны сваіх нямецкіх сяброў і дома. Пазнаёмілі іх з прадпрыемствамі Варапаева, госці наведалі Мінск, пабывалі на Нарачы, Браслаўскіх азёрах, удзельнічалі ў спартыўных спаборніцтвах. У калгасе імя Суворава, які мае даўнія трывалыя сувязі з Германіяй, таксама пабывалі, нават па самалёце пракаціліся. Адным словам, чым багаты, тым і рады. Вось гэта шчырасць і душэўнасць нашых людзей і прыйшлася найбольш даспадобы нямецкім гасцям.

Зрэшты, яны і самі не менш шчыра адгукнуліся на нашы праблемы, дапамаглі вучням і школе на справе. Спачатку прывезлі гуманітарную дапамогу, якая была размеркавана ў асноўным сярод шматдзетных, няпоўных і малазабяспечаных сем'яў, а потым, больш пазнаёміўшыся з праблемамі школы, прывезлі абсталяванне для яе сталовай. А яшчэ пішучую машынку з нямецкім шрыфтам для КІДа і канструктары для дзяцей рознага ўзросту. А паколькі свабоднае месца ў машыне ўсё адно засталася, а немцы, як вядома, народ практычны, то зноў быў арганізаваны збор адзення і абутку.

Пры сустрэчы дырэктар школы Алег Лявонцьевіч Лапушынскі расказаў пра тое, як пачыналася гэта дружба, як з цягам часу яна мацнела. Ля яе вытокаў стаіць шмат па-сапраўднаму багатых душой, шчырых і цікавых людзей. У іх ліку Клаус Бекер, інжынер, намеснік генеральнага дырэктара фірмы «Іна» па камерцыі. Фірма моцная выпускае шарыкападшыпнікі, а сам Клаус Бекер па справах фірмы бывае ў многіх краінах свету. Пэўны час ён з'яўляўся і старшынёй бацькоўскага камітэта школы. За ўсімі сваімі клопатамі і шматлікімі абавязкамі ён знайшоў час і магчымасць дапамагчы канкрэтнай сціплай школе ў Беларусі — Варапаеўскай сярэдняй. Адрас падказала перапіска, якую да гэтага часу наладзіў КІД Варапаеўскай СШ.

Клаус Бекер і ўзначальваў дэлегацыю з Германіі ў першы раз, па яго ініцыятыве была сабрана партыя гуманітарнай дапамогі, якую ён ад імя бацькоўскага камітэта сваёй школы перадаў для размеркавання бацькоўскаму камітэту Варапаеўскай школы.

У час нашай размовы А. Л. Лапушынскі не раз выказваў удзячнасць Клаусу Бекеру, характарызаваў яго як чалавека вялікай душы, які так уважліва ставіцца да нашых праблем, клапоціцца аб школе і нашых дзецях. За гэта, дарэчы, ніхто яму не плаціць, усё гэта ён зрабіў і працягвае рабіць па дабрыні душэўнай.

Настаўніца матэматыкі Марга Ауэр узначальвала нямецкую дэлегацыю ў наступны раз. Яна і прапанавала дружыць школамі. У мінулы раз яна сама правярала ўзровень ведання вучнямі нямецкай мовы, паабяцаўшы, што лепшыя паедуць у Германію. Канечне, гэта вялікі стымул як для дзяцей, так і для настаўнікаў. І гэта можна лічыць яшчэ адным вынікам работы клуба інтэрнацыянальнай дружбы.

А яшчэ ў свой час рэальная школа горада Герцоген Аураха арганізавала стажыроўку настаўнікаў нямецкай мовы, якую прайшлі ў Германіі 6 педагогаў з Дунілавіцкай, Навасёлкаўскай, Варапаеўскай і Гуцкай сярэдніх школ. Зноў добрая справа, новы штуршок і стымул для работы на новым, больш высокім узроўні.

Вось таму і не абмінуў цёплым словам вялікай удзячнасці дырэктар Варапаеўскай СШ настаўніцу С. А. Іванову, якая стварыла клуб інтэрнацыянальнай дружбы і арганізавала яго работу, якая цяпер прыносіць такія адчувальныя вынікі. Настаўніца яна і сапраўды моцная, сумела сур'ёзна зацікавіць вучняў нямецкай мовай. На сённяшні дзень у Мінскім лінгвістычным і Віцебскім педагагічным універсітэтах вучацца былыя члены клуба, яе нядаўнія вучні Галіна Дрозд, Аляксандр Шкорнік, Віталій Пайлак, Вольга Зямчонак, Вольга Таяновіч, Наталля Лапушынская. Выдатныя веды па замежнай мове паказвалі яе выхаванцы і раней, і таксама паступалі ў самыя прэстыжныя ВНУ. Думаецца, не будзе выключэннем і гэты год, выпускнікі падтрымаюць гонар школы.

А пакуль што Варапаеўская СШ жыве сваім звычайным жыццём. Хіба што крышачку асаблівасці надае яму вось гэта дружба. Неўзабаве зноў будуць прымаць у Варапаеве дэлегацыю з Германіі. Да сустрэчы рыхтуюцца ўжо цяпер.

С. ДЗЕРАВЯНКА.

„Pastawski kraj" (Regionalzeitung von Pastaw) 20 Mai 1998
Seite 2

Die Freunschaft kennt keine Grenzen

Kontakte

In der heutigen Zeit verlangt das Leben immer mehr Engagement. Dies soll durch verstärkte Kontakte und Aufnehmen von Geschäftsbeziehungen, darunter auch mit dem Ausland, erreicht werden. Es gibt unzählige Beispiele dafür, welche Vorteile solche Beziehungen den Unternehmen und Betrieben des Stadtbezirkes bringen. Beziehungen solcher Art gibt es im kulturellen Bereich, insbesondere in der Kunst, aber auch im Bildungswesen, was im Hinblick auf die Zukunft besonders wichtig und interessant erscheint.

Bis dahin sind es aber ganz gewöhnliche Kinder, die die Mittelschule in Warapajew besuchen. Sie zeichnen sich vielleicht dadurch aus, daß sie mit besonderem Interesse die deutsche Sprache lernen, die in Warspajew seit kurzem ab der ersten Klasse unterrichtet wird. Viele Schüler und Lehrer dieser Schule waren bereits in Deutschland.

Angefangen hat allerdings alles damit, daß in der Mittelschule von Warapajew auf Anregung der Deutschlehrerin Swetlana Arsenjewna Iwanowa ein Klub für internationale Freundschaft gegründet wurde. Unter der Leitung der Deutschlehrerin haben die Klubmitglieder Briefkontakte mit den Schülern der Realschule von Herzogenaurach in Bayern aufgenommen. Die Lehrerin Swetlana Arsenjewna gab sich jedoch damit nicht zufrieden, und so gelang es dem Klub, Treffen auf einer höheren Ebene zu organisieren - Austausch von Delegationen. Dies spricht für eine hervorragende Arbeit der Leiterin und der Mitglieder des Klubs.

Auch die deutsche Seite zeigte Interesse an einem solchen Austausch. Auf diese Weise kamen Schüler und Lehrer der Mittelschule von Warapajew nach Deutschland, bekamen die Möglichkeit, ihre Deutschkenntnisse zu vertiefen, da sie in den deutschen Familien wohnten; lernten das Land und die Menschen kennen.

Später nahmen sie herzlich ihre Freunde aus Deutschland bei sich zu Hause auf. Sie zeigten ihnen die Unternehmen von Warapajew, die deutschen Gäste besuchten die Haupstadt Minsk, waren am See Naratsch, an den Braslawer Seen, nahmen an Sportwettbewerben teil. Sie besuchten außerdem die Suworow-Kolchose, die langjährige Beziehungen mit Deutschland pflegt und hatten sogar die Möglichkeit, eine kurze Reise mit dem Flugzeug zu unternehmen. Mit einem Wort: was ich hab', geb' ich gern. Diese Aufgeschlossenheit und Gutherzigkeit unserer Landsleute hat den deutschen Gästen am meisten gefallen.

Ihrerseits hatten die Deutschen auch ein offenes Ohr für unsere Probleme und haben den Schülern und der Schule mit Rat und Tat beigestanden. Anfangs brachten sie humanitäre Hilfe, die haupsächlich unter Familien mit alleinerziehenden Eltern, kinderreichen und besonders armen Familien verteilt wurde; später erfuhren sie mehr über die Probleme der Schule, brachten eine Kücheneinrichtung, eine Schreibmaschine mit der deutschen Schrift für den Klub für internationale Freundschaft und Steckstein-Baukästen für Kinder verschiedener Altersstufen. Da aber im Auto noch Platz übrigblieb (und die Deutschen denken ja bekanntlich praktisch), wurde erneut Kleider- und Schuhesammlung organisiert.

Beim Treffen hat der Schuldirektor Aleg Ljawonzewitsch Lapuschynski darüber erzählt, wie diese Freundschaft entstanden ist, und wie sie im Laufe der Jahre intensiver wurde. Diese Freunschaft entstand durch herzensgute, aufrichtige und interessante Menschen. Zu ihnen zählt auch Klaus Becker, Ingenieur, Vertreter des Generaldirektors der Firma „Ina" im kommerziellen Bereich. Die Firma stellt Wälzlager her und Klaus Becker reist geschäftlich in viele Länder der Welt. Früher war er außerdem Sprecher des Elternbeirats der Realschule. Trotz vieler Sorgen und Verpflichtungen hat Klaus Becker Zeit und Möglichkeit gefunden, der Schule von Warapajew in Belarus mit konkreten Taten zu helfen. Auf die Adresse kamen wir durch die Briefkontakte, die bis heute aufrechterhalten werden. Das erste Mal leitete die Delegation aus Deutschland Klaus Becker, auf seine Initiative hin wurde humanitäre Hilfe gesammelt, die er im Namen des Elternbeirats seiner Schule an den Elternbeirat der Schule von Warapajew übergab, damit sie weiterverteilt wird.

Während unseres Gesprächs hat sich A. L. Lapuschynski mehrmals über die Anteilname von Klaus Becker geäußert, er beschrieb Klaus Becker als einen herzensguten Menschen, der sich so eingehend mit unseren Problemen befaßt, sich um die Schule und um unsere Kinder kümmert. Übrigens, dafür wird Klaus Becker nicht bezahlt, all dies hat er gemacht und macht weiterhin nur ehrenamtlich.

Diesmal leitete die deutsche Delegation die Mathematiklehrerin Marga Auer. Sie war es auch, die vorgeschlagen hatte, eine Freundschaft zwischen den Schulen aufzubauen. Sie hat persönlich die Deutschkenntnisse der Schüler geprüft, und versprach ihnen, daß die Besten nach Deutschland fahren. Dies ist natürlich ein großer Ansporn wie für die Kinder, so auch für die Lehrer. Und dies kann man als ein weiteres Ergebnis der Arbeit des Klubs für internationale Freundschaft betrachten.

Zuvor hat die Realschule von Herzogenaurach ein Praktikum für die Deutschlehrer organisiert. Dieses Praktikum absolvierten in Deutschland sechs Lehrer aus den Mittelschulen von Dunilawizk, Nawaselkaw, Warapajew und Guzk. Eine gute Sache mehr, neuer Schritt und Ansporn zur Arbeit auf einer höheren Ebene.

Aus diesem Grunde hat der Direktor der Mittelschule in Warapajew das große Engagement der Lehrerin S. A. Iwanowa mit gutem Wort erwähnt. Sie hat den Klub für internationale Freundschaft ins Leben gerufen und hat seine Arbeit organisiert, die nun solche guten Ergebnisse zeigt. Die Leiterin des Klubs ist in der Tat eine starke Persönlichkeit, sie konnte das Interesse der Schüler für die deutsche Sprache wecken. Heute studieren an der Universität für Sprachen in Minsk und an der pädagogischen Hochschule in Witebsk die ehemaligen Klubmitglieder, die ehemaligen Schüler der Schule in Warapajew: Galina Drosd, Aljaxandr Schkornik, Winali Pailak, Wolga Sjamtschonak, Wolga Tajanowitsch, Natallja Lapuschynskaja. Die Schüler aus Warapajew haben auch früher über gute Fremdsprachenkenntnisse verfügt und sind genauso an die besten Universitäten gegangen. Auch dieses Jahr wird wohl keine Ausnahme sein, und die Schulabsolventen werden den guten Ruf der Schule bewähren.

Bis dahin geht das Leben in der Mittelschule von Warapajew ganz normal weiter. Diese Freundschaft verleiht aber der Schule eine gewisse Besonderheit. Demnächst wird man in Warapajew wieder eine Delegation aus Deutschland in Empfang nehmen. Bereits heute wird alles für dieses Treffen vorbereitet.

S. Dserawjanka